18 лютага адбыўся турнір знаўцаў беларускай мовы”Роднай мовы пералівы”. Мерапрыемства прымеркавана да Міжнароднага дня роднай мовы. Удзельнікам растлумачылі , чаму дзень 21 лютага лічыцца Днём роднай мовы. Рабяты з Моваведкай віталіся па – беларуску, прыводзілі вядомыя ім ветлівыя словы, раскрывалі скарбонку беларускай мовы і высвятлялі, хто з іх лепш за ўсіх ведае яе сакрэты. Гучалі жарты, загадкі, вершы, апавяданні, казкі, прыказкі і прымаўкі. Рабяты выступалі ў ролі перакладчыкаў на родную мову з рускай. Увазе ўдзельнікаў была прапанавана прэзентацыя “Гаворым па — беларуску”.



